# Бронзавы век на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна

## Агульная характарыстыка

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна пачаўся бронзавы век, які працягваўся амаль паўтара тысячагоддзя. Аднак з-за адсутнасці мясцовай сыравіны, першых металічных вырабаў было мала. Гэта былі ў асноўным упрыгожанні, шылы, сякеры, наканечнікі коп'яў.

Пераважную большасць прылад працы і зброі выраблялі з крэменю і косці. Асабліва характэрнымі для новай эпохі сталі каменныя шліфаваныя сякеры, булавы і матыкі з прасвідраванымі для рукаятак адтулінамі.

Пасля меднабронзавых вырабаў і свідраваных каменных прылад трэцяй, найбольш характэрнай прыкметай матэрыяльнай культуры бронзавага веку на нашай тэрыторыі стала паўсюднае пашырэнне пласкадоннага посуду, featрознага па памерах і формах. Гэта сведчыць пра з'яўленне ў чалавечым жыллі агнішчаў з роўным подам, дашчатых сталоў і паліц, а таксама пра большую разнастайнасць у харчаванні.

Для бронзавага веку характэрна пашырэнне і развіццё земляробства і жывёлагадоўлі, пры захаванні, аднак, значнай ролі прысвойваючых формаў гаспадарання – палявання, рыбалоўства і збіральніцтва.

## Бронзавы век на тэрыторыі раёна

У нашай мясцовасці на познанеалітычнай аснове сфарміравалася раннябронзавая **паўночнабеларуская культура.**

Паселішчаў носьбітаў паўночнабеларускай культуры найбольш знойдзена на Крывінскім тарфяніку (Асавец 1, Асавец 2 – верхні пласт, Асавец 3, Асавец 7 і інш.).У першай палове 2-га тысячагоддзя да н. э. на месцы сучаснага балота яшчэ захоўвалася некалькі азёр, злучаных пратокамі.

Мясцовыя зарастаючыя вадаёмы былі асабліва багатыя рыбай і вадаплаўнымі птушкамі. Навакольныя разнастайныя па пародах дрэў лясы давалі прытулак шматлікім звярам. На

сухіх затарфаваных участках можна было з поспехам займацца земляробствам, а на навакольных лугах хапала пашы свойскім жывёлам. У такіх спрыяльных умовах мясцовае насельніцтва прыкметна павялічылася. Пра гэта сведчыць тое, што паміж сённяшнімі вёскамі Галоўск і Асавец на адлегласці ў 5 км знойдзена 7 стаянак з матэрыяламі паўночнабеларускай культуры. А трэба ўлічыць, што археолагі пакуль што выявілі тут далёка не ўсе мясціны, абжытыя старажытнымі крывінцамі.

## Заняткі насельніцтва

Пры раскопках мясцовых паселішчаў добра прыкметна, як мяняліся гаспадарка тубыльцаў, іх матэрыяльная і духоўная культура. Як побыт неалітычных паляўнічых і рыбаловаў паступова набываў характар побыту земляробаў і жывёлаводаў бронзавага веку.

Напачатку мясцовыя жыхары карысталіся вастрадонным посудам з дамешкамі тоўчаных ракавін у сценках з заштрыхаванымі паверхнямі. Пасудзіны былі шчыльна ад краю да донца пакрытыя ўзорамі з грабеньчатых і ямчатых адбіткаў, з насечак, наколаў і іншых арнаментальных элементаў. Знешне яны выглядалі як плеценыя з лазы кошыкі.

Пазней адначасова з вастрадоннымі з'яўляюцца пласкадонныя пасудзіны. У гліняных сценках гаршкоў, кубкаў, разнастайных місак і місачак, акрамя тоўчаных ракавінак, прыкметныя і пясчаныя дамешкі, а таксама зярняты жарствы. Сярод арнаментаў пашыраюцца шнуравыя і нарэзкавыя ўзоры.

Крамянёвыя вырабы яшчэ захоўвалі пераважна неалітычныя формы. Аднак носьбіты паўночнабеларускай культуры пачалі выкарыстоўваць і шліфаваныя сякеры, долаты і цяслы, навучыліся вырабляць сякеры з прасвідраванымі адтулінамі.

Крывінцы дасягнулі асабліва высокага майстэрства ў апрацоўцы рогу і костак. Наканечнікі стрэл, гарпуны, рыбацкія кручкі, кінжалы і іншыя вырабы ўражваюць

сваімі формамі і якасцю выканання. У тубыльцаў нават былі касцяныя лыжкі!
Калі меркаваць па знойдзеных пры раскопках костках, найчасцей пад стралу або кап'ё крывінца траплялі ласі. Іх было сапраўды шмат у навакольных нізкіх і цёмных лясах і прыбалацях. Другой па колькасці здабычай быў дзік. Шмат палявалі і на мядзведзяў. Радзей ўдавалася здабываць жыхароў светлых лясных прагалін — аленяў, зуброў, тураў, казуль. Шмат на стаянках костак бабра. З упаляваных баброў атрымлівалі цёплыя скуры, мяса і тлушч, лекавыя рэчывы, сківіцы з разцамі ў якасці рабочых інструментаў, зубы для майстравання ўпрыгожанняў.
Надзейнай крыніцай мяса, малака і скур для мясцовага жыхарства стала жывёлагадоўля. Тут гадавалі найболып кароў і свіней, менш – авечак і коз. Ну і зразумела, пры чалавеку здаўна быў сабака.
Паўночная Беларусь была яшчэ далей ад старажытных металургічных цэнтраў, чым Беларусь Паўднёвая. Але і сюды пачаў трапляць метал. На стаянках Крывінскага тарфяніка знойдзена некалькі медных шылаў.
У канцы бронзавага веку з-за частых дажджоў зноў паўнаводным стала старажытнае Крывінскае возера. Берагі былі затопленыя, а жыхары тутэйшых паселішчаў перасяліліся на вышэйшыя мясціны.



*Цікавая арнаментацыя*



*Крамянёвы наканечнік*



*Археалагічныя раскопкі на паселішчы Асавец-7*

## Духоўная культура бронзавага веку

### Рэлігія і мастацтва

Насельніцтва паўночнабеларускай культуры ў асноўным захавала рэлігійныя вераванні папярэдняга часу. Да традыцыйных неалітычных упрыгожанняў з зубоў жывёл і касцяных пласцінак дабавіліся разнастайныя бурштынавыя вырабы, характэрныя для ранняга бронзавага веку Прыбалтыкі. Непераўзыдзенымі ўзорамі першабытнага мастацтва з'яўляюцца скульптурныя выявы людзей, птушак і змей, знойдзеныя на асавецкіх стаянках.



*Качкі з іклаў дзіка. (Асавец-2)*



*Касцяная статуэтка*

Нават звычайныя адшчэпы з дзіковых іклаў або костак пад крамянёвымі разцамі і нажамі тутэйшых умельцаў набывалі запамінальныя абрысы жывых істот.
Усе гэтыя статуэткі, розныя ўпрыгожанні, шмат якія арнаменты на гаршках мелі магічны сэнс і адлюстроўвалі перажыткавыя яшчэ неалітычныя рэлігійныя вераванні. Аднак на крывінскіх гаршках пазнейшага часу з'яўляюцца і ўзоры сімвалы, звязаныя з вераваннямі першабытных земляробаў, характэрнымі для бронзавага веку.





*Бурштынавыя пацеркі. Асавец-2*



*Жалейкі з птушыных костак.*



*Свідраваны зуб для падвескі.*

## Следавікі.

Гэтую назву носяць камяні, якія маюць на сваёй паверхні паглыбленні падобныя на след чалавека, або жывёлы. У паглыбленняў розная форма: адбітак босай нагі, чаравіка, далоні, лап і капытаў розных звяроў. Звычайна след на валунах адзінкавы, але бывае па два, тры адбіткі адразу.Як правіла сляды маюць натуральныя памеры, але сустракаюцца і маленькія, і сляды-веліканы. Паглыбленні на валунах бываюць натуральныя, якія ўзніклі ў выніку выветрывання. Бываюць зробленыя рукамі чалавека. Амаль кожны следавік мае імя. Сляды часта прымалі за



*Камень следавік каля вёскі Астроўна.*

доказ знаходжання жыхароў неба на беларускай зямлі і называлі: След Богамаці, След Боскі, Боская Ножка, След Хрыста, След Анёлка. Так ужо вядзецца, што багоў заўсёды суправаджае нячыстая сіла. Таму трапляюцца назвы: След Чорта, След Д’ябла, Чортава Ступень. Своеасаблівая група следавікоў – высечаныя на валунах падковы. Лічаць, што гэтыя знакі высечаныя на камянях як сімвал шчасця, якраз так, як зараз прыбіваюць падкову да дзвярэй або сцяны хаты. Камяні-следавікі ў Беларусі ўсюды вылучаліся сярод звычайных валуноў і часта шанаваліся. Іх лічылі гаючымі, і лячыліся сабранай з паглыбленняў вадой. Часам яны станавіліся прошчай – месцам паломніцтва. Камень, названы Ступня, з крыжам і старажытным

надпісам у вёсцы Лукомль быў так зацёрты пацалункамі вернікаў, што надпіс ужо не чытаўся. З якой мэтай чалавек высякаў сляды або шукаў іх натуральныя аналагі? Даследчыкі старажытных знакаў думаюць, што ў далёкім мінулым у нашых продкаў следавікі былі месцамі малення за ўдалае паляванне, язычніцкім алтаром, сюды прыносілі ахвяры. Акрамя таго, гэтымі камянямі пазначалі межы ўладанняў плямёнаў, княстваў. Тут ушаноўвалі продкаў, герояў, багоў; мечаныя глыбы ставілі як паказальнікі шляху. Часам мяркуюць, што валуны-следавікі звязаны з боствам Сонца, якое ішло па свеце, несла святло і цяпло, прыносіла багаты ўраджай.

Звярыныя адбіткі маглі належаць апекуну жывёлы, напрыклад Вялесу, або татэмным жывёлам асобных родаў.

Да часоў, калі панавалі язычніцкія вераванні, адносіцца камень-следавік каля в. Астроўна — старажытны культавы помнік. Адбітак на камені нагадвае след чалавечай нагі. Мяркуецца, што пакланенне камяням-следавікам узнікла ў бронзавым веку, але яно існавала і пазней.

***Склаў С.Леаненка***